Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj historyi
Fond 2 sprava 99

## ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

***Лукашэнка і яго маскоўскія «сябры» хочуць далучыць Беларусь да Расіі.***

ЧАМУ? -- Бо і ў Беларусі, і ў Расіі эканоміку давялі да ручкі. Цяпер, каб не адказваць перад народамі, хочуць схаваць канцы ў ваду. Пад размовы пра «інтэграцыю» можна лёгка *яшчэ раз абабраць людзей.*

ШТО ЗНАЧЫЦЬ АДЗІНАЯ З РАСІЯЙ ДЗЯРЖАВА? -- Адзіная дзяржава – гэта **адзіная армія**. Значыць, нашым хлопцам трэба будзе абавязкова ісці ваяваць за чужыя інтарэсы на Каўказ, у Таджыкістан, Прыднястроўе, на Балканы – усюды, дзе ваюе і будзе ваяваць Расія.

**Адзіная дзяржава – гэта адзіныя грошы**. Значыць, як і дзесяткам мільёнаў расіян, нам давядзецца месяцамі і гадамі не атрымліваць зарплат ды пенсій.

**Адзіная дзяржава – гэта адзіная армія карумпаваных чыноўнікаў.** Значыць, уся дапамога нашай эканоміцы, нашым чарнобыльцам, нашай культуры будзе дзяліцца ў Маскве – і раскрадацца намнога хутчэй, чым цяпер.

**Адзіная дзяржава – гэта адзіная мафія**. Значыць, і нас чакаюць заказныя забойствы палітыкаў, журналістаў і проста сумленных людзей.

**Адзіная дзяржава – гэта адзіная сталіца**. Значыць, нашаму Мінску трэба будзе стаць губернскім горадам – такім, як Разань, Кастрама або Тамбоў.

ЦІ ХОЧАМ МЫ ГЭТАГА? -- НЕ, НЕ І НЕ!!!

ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ? Уступайце ў Беларускі Народны Фронт «Адраджэньне», дэмакратычныя партыі. Адстойвайце Канстытуцыю 1994 года. Патрабуйце адстаўкі Лукашэнкі. Далучайцеся да грамадзянства Беларускай Народнай Рэспублікі!

**Беларускі Народны Фронт «Адраджэньне»**
*Мінск-5, вул.Варвашэні, 8, тэл./факс (017)284 5012.*

1999

# ЗАРОБКІ, ПЕНСІІ І ЦЭНЫ Ў ЛІТВЕ

## ЗАРОБКІ

### Настаўнікі

Без катэгорыі ≈ $ 255
Старэйшы настаўнік (без надбавак за класнае кіраўніцтва і праверку сшыткаў) ≈ $ 280

### Мед. персанал

Медсястра ≈ $ 195
Урач (сярэдняя) ≈ $ 350
Інжынер-праграміст ≈ $ 350-400
Няня ў дзіцячым садку ≈ $ 120
Мінімальны заробак ≈ $ 100
Пенсія (сярэдняя) ≈ $ 125

## КОШТЫ

Масла (1 кг) — 600 тыс. бел. рублёў
Калбаса (вароная) (1 кг) — 550 тыс. бел рублёў
Свініна (1 кг) — ад 400 да 800 тыс. бел рублёў
Цукар (1 кг) — 170 тыс. бел рублёў
Рыба (карп) (1 кг) — 360 тыс. бел рублёў
Яйкі (1 дзясятак) — 120 тыс. бел рублёў
Куры (1 кг) — 500 тыс. бел рублёў
Яблыкі (1 кг) — 120 тыс. бел рублёў
Бананы (1 кг) — 120 тыс. бел рублёў
Мандарыны (1 кг) — 250 тыс. бел рублёў
Апельсіны (1 кг) — 250 тыс. бел рублёў

На Беларусі 1 $ ≈ 300 тыс. бел рублёў (на 14.01.1999г.)

**АСТАТНЯЕ ПАДЛІЧЫЦЕ І ПРААНАЛІЗУЙЦЕ САМІ! ПАДУМАЙЦЕ, ЧАМУ У НЕЗАЛЕЖНАЙ І ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ЛІТВЕ ЖЫВУЦЬ ЛЕПШ, ЧЫМ У БЕЛАРУСІ, У ЯКОЙ ДЫКТАТУРА І ЯКАЯ Ў САЮЗЕ З РАСЕЯЙ!**